# СТАРААБРАДЦЫ ЯК ЧАСТКА РУСКАГА ЭТНАСУ НА ГОМЕЛЬШЧЫНЕ Ў 20-Я – 30-Я ГГ. XX СТ.

**С.А. Пасталоўскі**

Стараабрадцы, якіх у вялікай ступені можна лічыць этнічна чыстымі расейцамі (рускімі), традыцыйна кампактна пражывалі на хутарах і адрубах ва усходняй частцы сучаснай Гомельшчыны ( у Веткаускім і Добрушскім раенах), а таксама у шэрагу населеных пунктау разам з беларускім і яурэйскім насельніцтвам: у тых жа раёнах. Да 1926г. стараабрадцы гэтых тэрыторый афіцыйна пражывалі у РСФСР, і пасля далучэння да БССР яны змянілі статус тытульнага (асноунага) этнасу на статус нацыянальных меншасцей (нацмен). Для іх абслугоування пачалі стварацца нацыянальныя расейскія сельсаветы і школы на расейскай мове. Пачынаючы з 30-х гадоу, мяжа паміж статусам тытульнага этнаса і нацмен паступова знікае.

Але знаходзячыся у гэтай кампактнай зоне, стараабрадцы мелі агульныя рысы са стараабрадцамі расейскіх тэрыторый: кансерватыунасць, рэлігійны фанатызм і дэталевыя адносіны да выканання рэлігійных абрадау, імкненне існаваць адасоблена ад іншых этнасау і праявы нацыянальнага антаганізму, агульнасць побыту і эканамічна-гаспадарчых заняткау, адмоуныя адносіны да "антыхрысту" (Савецкая і, наогул, усялякая улада, яе мерапрыемствы) і яго пячаткі (дакументы, подпісы), у т.л. да калектывізацыі, якая успрымалася як "сатанінская справа", адхілялася рэлігійнай свядомасцю стараабрадцау і зусім не адпавядала індывідуальнаму характару іх гаспадарання.

Стараабрадцы адрозніваліся кансерватызмам, але і прыстасоуваліся да новых умоу: напрыклад, іх дзеці у большасці сваей вучыліся у расейскіх школах, а не дома. Яны негатыуна адносіліся да беларусізацыі, затрымлівалі дзяцей дома у часы рэлігійных свят, не давалі чытаць беларускія кнігі. Што датычыцца самаідэнтыфікацыі, то сябе яны называлі "стараабрадцамі" ці "велікарусамі", а беларусау – "мазепамі","хахламі", тым самым адасабляючыся ад іх. Тэрмін "стараабрадзец=велікарус" быу рауназначны "расейцу (рускаму)", але не наадварот.

Увогуле, 20-я – 30-я гады аказалі на стараабрадцаў вялізны ўплыў. Пачала разбурацца традыцыйная, патрыярхальная структура іх рэлігійнага, эканамічна-гаспадарчага існавання, сямейнага жыцця; пачалі набіраць моц цэнтрабежныя тэндэнцыі і асіміляцыйныя працэсы, парушаючыя еднасць стараабрадцаў у рэлігійнай грамадзе і адасобленасць сярод беларускамоўнага асяроддзя; пачалі складвацца іншыя адносіны паміж старымі і моладзю. Парушалася традыцыя, і ў гэтым вялікую ролю адыгралі мерапрыемствы Савецкай улады.